УДК 94(476)«14/15»

А. У. Казакоў, аспірант

# ЭМІГРАНТЫ З РУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ (СЯРЭДЗІНА XV – 30-Я ГГ. XVI СТСТ.): САЦЫЯЛЬНЫ СКЛАД

The article is devoted to the social stratification of the mass of nobles that emigrated from principalities of Rus' to the Grand Duchy of Lithuania during the period from the mid XV century to the end of 1530th. Among emigrants different strata of Russian noble class were represented. They can be divided into two big groups – princes and untitled nobility. The first group consists of grand princes, appanage princes and service princes. Within the second group two categories are marked out (relatively to some extend): boyar aristocracy and minor untitled nobility (deti boyarskie).

**Уводзіны.** З сярэдзіны XV і да канца 30-х гг. XVI стст. усходнюю мяжу Вялікага княства Літоўскага перасяклі і назаўсёды засталіся ў гэтай дзяржаве прадстаўнікі розных катэгорый прывілеяванага саслоўя зямель Русі. Паходжанне эмігрантаў (сацыяльная і родавая прыналежнасць) нярэдка прадвызначала палітыку ўладаў ВКЛ у адносінах да чужынцаў. Акрамя таго, прычыны і матывы ад'езду прадстаўнікоў розных сацыяльных катэгорый не былі аднолькавымі [1, с. 36]. Таму адной з патрабуючых вырашэння праблем, якія стаяць перад даследчыкам пры вывучэнні гісторыі эміграцыі знаці з рускіх зямель у ВКЛ, з'яўляецца дыферэнцыяцыя масы перасяленцаў па сацыяльнай прыкмеце. Нягледзячы на павышэнне ў апошні час інтарэса да тэмы ў айчыннай і расійскай гістарыяграфіі, дагэтуль не рабілася спроб прааналізаваць сацыяльны склад эмігрантаў з рускіх зямель, што перасяліліся ў ВКЛ у перыяд з сярэдзіны XV і да канца 30-х гг. XVI стст. Выкананне гэтай задачы і з'яўляецца мэтай дадзенага артыкула.

**Асноўная частка**. На працягу акрэсленага перыяду ў ВКЛ з'явіліся князі з удзельных родаў Маскоўскай дзяржавы, з Разанскай зямлі і Цвярскога княства: Васіль Яраславіч, князь Бараўскі, Іван Васільевіч Яраславіч, Іван Дзмітрыевіч Шамячыч, Іван Андрэевіч Мажайскі, Васіль Міхайлавіч Вярэйскі Удалы, Міхаіл Барысавіч Цвярскі, Іван Іванавіч Разанскі.

Маскоўская ўдзельная арыстакратыя была прадстаўлена ў ВКЛ наступнымі асобамі, якія эміგравалі сюды ў сярэдзіне – канцы XV ст.

*Васіль Яраславіч*, князь Бараўскі і Серпухоўскі, быў нашчадкам Івана Данілавіча Каліты – вялікага князя маскоўскага. Сын апошняга Андрэй атрымаў Бараўск у якасці ўдзела. Васіль Яраславіч даводзіўся ўнукам герою Кулікоўскай бітвы Уладзіміру Андрэевічу Харобраму, стрыечнаму брату вялікага князя Дзмітрыя Іванавіча Данскога [2, с. 238]. В. Я. Бараўскі з'явіўся ў ВКЛ на непрацяглы час, тады як яго сын *Іван Васільевіч* асеў там назаўсёды. Як бацька, так і сын былі вядомы ў ВКЛ пад родавым празваннем *Яраславіч* (Ярославич, Ерославич, Ярославович).

*Іван Дзмітрыевіч Шамячыч* быў сынам удзельнага князя Галіцкага Дзмітрыя Юр'евіча Шамякі і праўнукам Дз. Данскога [2, с. 238; 3, с. 60, схема 7]. Бацька І. Шамячыча працяглы час аспрэчваў права на вялікакняскі маскоўскі пасад у свайго стрыечнага брата Васіля II Васільевіча і нават на невялікі перыяд заняў яго.

*Іван Андрэевіч Мажайскі*, таксама, як і Дз. Шамяка, даводзіўся стрыечным братам вялікаму князю Васілю II і ўнукам Дз. Данскому. Ад апошняга бацька Івана Андрэевіча атрымаў ва ўдзел Мажайск [2, с. 238]. І. А. Мажайскі, разам з Васілём Яраславічам Бараўскім і Дз. Шамякам, былі аднымі з галоўных дзеючых асоб міжусобнай барацьбы ў Маскоўскай дзяржаве 1425–1453 гг. [4, с. 134–135].

*Васіль Міхайлавіч Вярэйскі Удалы* быў старэйшым сынам Міхаіла Андрэевіча, унука Дзмітрыя Данскога і роднага брата І. А. Мажайскага [2, с. 238]. Міхаіл Андрэевіч, атрымаўшы Вярэю і Белавозера, паклаў пачатак роду князёў Вярэйскіх.

Эмігрантам з Цвярской зямлі быў нашчадак і апошні прадстаўнік цвярскога вялікакняскага дома *Міхаіл Барысавіч.*

У розны час у ВКЛ з'явіліся *Фёдар Іванавіч*, яго сын *Юрый* і *Дзмітры Андрэевіч Пронскія* – удзельныя князі Разанскай зямлі. Род Пронскіх вылучыўся з лініі Разанскіх князёў, якія былі адгалінаваннем Вольгавічаў, ці чарнігаўскіх Рурыкавічаў [5, дадатак, табл. VII]. Пронскія князі прыгадваюцца ў шэрагу з разанскімі і мурамскімі яшчэ ў 1131 г. У пачатку XV ст. яны выступілі сур'ёзнымі апернікамі князёў разанскіх у барацьбе за вяршэнства ў сваім рэгіёне.

У XVI ст. спіс эмігрантаў з ліку вышэйшай арыстакратыі рускіх зямель папоўніў *Іван Іванавіч*, вялікі князь разанскі. Ён, таксама як і М. Б. Цвярскі, стаў апошнім прадстаўніком свайго роду і апошнім палітычным лідэрам свайго княства.

З ліку служылай тытулаванай знаці ў ВКЛ эміgравалі наступныя асобы: Давід Кубенскі, Іван Львовіч Барацінскі, Дзмітры Іванавіч Губка Шуйскі, Сямён Фёдаравіч Бельскі, Мацвей Мікіцініч. Усе яны, акрамя Д. Кубенскага, ад'ехалі ў першай трэці XVI ст.

*Давід Кубенскі* паходзіў з роду Заазерскіх-Кубенскіх, якія былі адгалінаваннем Яраслаўскіх князёў [6, с. 93–94]. Гэта асоба невядома па

радаслоўях, але прыгадваецца ў ВКЛ сярод людзей князя Сямёна, сына Івана Дзмітрыевіча Шамячыча [7, с. 11]. Дз. Шамяка быў у сваяцтве з Заазерскімі-Кубенскімі праз шлюб з дачкой Дзмітрыя Васільевіча Заазерскага [6, с. 94].

Род *Івана Львовіча Барацінскага* быў адгалінаваннем роду Мезецкіх, якія ў сваю чаргу паходзілі ад Чарнігаўскіх князёў. Родапачынальнікам Барацінскіх быў князь Аляксандр, сын Андрэя Усеваладавіча [8, s. 7–8]. Сваё родавае імя Барацінскія атрымалі ад назвы воласці на р. Клязьме-Барацін, якой валодаў Аляксандр Андрэевіч (памёр да 1443 г.). Калі ягоны ўнук Іван Львовіч эміграваў у ВКЛ, Барацінскія знаходзіліся на маскоўскай службе (з 1494 г.).

*Дзмітры Іванавіч Губка Шуйскі* быў прадстаўніком адной з дзвюх асноўных галін суздальскіх князёў. Суздальска-Ніжэгародскае княства згубіла сваю самастойнасць у канцы XIV ст. Паводле тэстаменту Васіля І маскоўскага Ніжні Ноўгарад павінен быў адысці яго сыну Васілю, але Суздаль там не прыгадваецца. Магчыма, у ім сядзелі напаўзалежныя ад Масквы князі. У 1461–1462 гг. Васіль ІІ Цёмны перадаў Суздаль свайму сыну Івану [6, с. 67]. Бліжэйшыя сваякі збеглага ў ВКЛ Івана Дзмітрыевіча знаходзіліся на маскоўскай службе і адыгрывалі значную ролю ў дзяржаўным жыцці ВКМ у канцы XV – першай трэці XVI стст.

*Сямён Фёдаравіч Бельскі* вёў свой род ад вялікага князя літоўскага Альгерда. Яго ўнука Івана Уладзіміравіча прынята лічыць родапачынальнікам Бельскіх [8, s. 3; 3, с. 55], хоць, як адзначае Ю. Вольф, дакладна невядома, хто менавіта атрымаў у спадчыну г. Белая на маскоўскім памежжы – князь Іван Уладзіміравіч ці яго дзеці (сам І. У. Бельскі «носіць» гэта родавае прозванне толькі ў крыніцах больш позняга паходжання) [8, s. 3]. Сын Івана Уладзіміравіча і бацька Сямёна Фёдар браў удзел у раскрытай змове супраць вялікага князя Казіміра, з-за чаго ў 1481–1482 г. быў вымушаны ратавацца ўцёкамі ў ВКМ; у 1500 г. за ім паследаваў ягоны брат Сямён. Там Бельскія былі набліжаны да вялікакняскага двара, аб чым, у прыватнасці, сведчыць шлюб паміж Іванам Фёдаравічам і пляменніцай Івана III Ганнай Васільеўнай Разанскай. Ф. І. Бельскі і тры яго сыны, у тым ліку сам Сямён Фёдаравіч, да сваіх уцёкаў у ВКЛ адыгрывалі прыкметныя ролі ў дзяржаўна-палітычным жыцці Маскоўскай дзяржавы [6, с. 124–127; 9, с. 99–100].

*Мацвей Мікіціні*ч з'яўляўся служэбнікам вялікай княгіні літоўскай і каралевы польскай Алены Іванаўны, дачкі вялікага князя маскоўскага Івана III. Яго паходжанне дагэтуль застаецца дакладна невядомым. Спынімся падрабязней на існуючых версіях.

Нашчадкі М. Мікіцініча ў другой палове XVI ст. сталі ўжываць найменне Галоўчынскіх (ад назвы аднаго з належаўшых ім маёнткаў – Галоўчын), а ў XVII ст. пачалі выкарыстоўваць імя Рапалоўскіх [8, s. 116]. Рапалоўскія былі адным з адгалінаванняў Старадубскіх князёў, добра вядомым ў ВКМ у XV–XVI стст. [6, с. 40–42]. Гэта дазволіла К. Нясецкаму вывадзіць род Мікіцінічаў з Севершчыны [10, s. 364]. У вядомых радаслоўных запісах Рапалоўскіх, аднак, аб Мікіцінічах няма ніводнай згадкі. Ю. Вольф асцярожна дапускае існаванне сувязі Мікіцінічаў з Рапалоўскімі, але не робіць больш канкрэтных высноў [8, s. 116].

Спробу праліць святло на паходжанне Мацвея Мікіцініча (у сувязі з радаслоўем князёў Пуцяціных) зрабіў у рамках невялікага даследавання У. Бязроднаў. Ён прыйшоў да высновы, што М. Мікіцініч належыў да адной з галін Старадубскіх князёў [11, с. 31–33]. Але гэта версія яго паходжання не ўяўляецца пераканаўчай [12, с. 80].

Такім чынам, вышэйшы сацыяльны пласт эмігранцкай знаці складалі ўдзельныя князі Маскоўскай дзяржавы і Разанскай зямлі, уладары Разані і Цвяры, а таксама прадстаўнікі служылых княскіх родаў Русі.

Колькасна, аднак, гэту катэгорыю пераўзыходзіла нетытулаваная знаць, якая таксама не ўяўляла сабой аднароднай масы. Тут былі прадстаўлены як вядомыя баярскія, так і дробныя служылыя роды. Да першай з названых груп можна аднесці наступных асоб.

*Міхаіл Дзмітрыевіч Шарап* паходзіў са старадаўняга роду, пачынальнікам якога лічыцца легендарны Аляксандр Нетша, нібыта прыехаўшы ў Маскву з Нямеччыны пры Іване Каліце. Нетшычы розных галін служылі пры дварах маскоўскіх вялікіх і ўдзельных князёў, у тым ліку І. А. Мажайскага і В. Я. Бораўскага (Яраславіча), некаторыя з іх нават уваходзілі ў вялікакняскую думу. М. Д. Шарап збег у ВКЛ разам з В. М. Вярэйскім [6, с. 254–257]. Там, аднак, знаходзім яго на службе І. В. Яраславічу. Гэта можна патлумачыць даўнімі сувязямі яго родзічаў з Яраславічамі-Бораўскімі.

*Юрый Елізаравіч Гусеў* належаў да фаміліі Дабрынскіх, якія выводзілі свой род ад легендарнай асобы багатыра Радзегі (Редега). Прадстаўнікі гэтага роду, таксама як і Нетшычаў, служылі розным князям, але найбольшага поспеху дасягнулі тыя, што звязалі свой лёс з маскоўскім дваром. Бацька ж Юрыя Елізар Васільевіч Гусеў быў на службе ў І. А. Мажайскага [6, с. 220–223].

*Іван Цімафеевіч Юрлоў* быў прадстаўніком старадаўняй баярскай фаміліі Пляшчэевых. Яго продкі паходзілі з Чарнігаўскай зямлі, але яшчэ ў пачатку XIV ст. пачалі служыць у Маскве, займаючы не апошнія пасады пры двары. Бацька І. Юрлова Цімафей Міхайлавіч Юрло Пляшчэеў у канцы XV ст. нават уваходзіў у думу (прыгадваецца ў якасці акольнічага). Сам Іван Цімафеевіч таксама служыў пры двары Івана III [6, с. 197].

*Іван Васільевіч Лядскі* (Ляцкий) – найбольш знакаміты прадстаўнік маскоўскай баярскай арыстакратыі сярод эмігрантаў. Ён належаў да роду Кошкіных – адной са старамаскоўскіх фамілій, якая паходзіла ад Фёдара Кошкі, сына баярына Андрэя Кабылы, каторы даў пачатак некальκім буйным родам. Бацька Івана Васільевіча – Васіль Захар'евіч – меў уладанні на Ляцкім пагосце Шалонскай пяціны, ад чаго і атрымаў празванне «Ляцкий», якое замацавалася за нашчадкамі. В. З. Лядскі не праявіў сябе на дзяржаўнай службе (магчыма, з-за ранняй смерці), а вось яго браты Якаў і Юры сталі буйнымі палітычнымі і вайсковымі дзеячамі пры Іване III, былі думнымі баярамі [6, с. 183–185]. Сам І. В. Лядскі, нягледзячы на адсутнасць падтрымкі з боку бацькі, заняў высокае месца ў дзяржаўнай іерархіі пры Васілі III.

Найбольш шырока, шо не дзіўна, сярод эмігранцкай знаці былі прадстаўлены дробныя служылыя роды. Так, пры вялікім князе Казіміры ў ВКЛ прыехалі Панфілавы (Панфілавічы), Пантусавы (Пантусовічы) і Шчарбовы (Шчарбовічы), якія на працягу не аднаго пакалення служылі гаспадарскімі сакольнікамі ў Навагародку [13, арк. 106 (адв.)–108]. Разам з Аленай Іванаўнай з Маскоўскай дзяржавы выехалі Семічавы [7, с. 173, 226–227, 251, 254, 481; 14, арк. 116 (адв.)–117]. У першай трэці XVI ст. у ВКЛ прыгадваюцца Аляксандравы, Вешняковы, Гарбузавы, Зузіны, Разанцавы, Шышкіны, Ярлыковы, Ярцовы і многія іншыя выхадцы з рускіх зямель.

Захаваліся звесткі і аб зусім нерадавітых прадстаўніках служылага саслоўя Русі, выехаўшых у ВКЛ. Часта крыніцы паведамляюць толькі іх імя альбо мянушку, што робіць немагчымым дакладнае высвятленне паходжання гэтых асоб. Так, у запісах «отправ» Жыгімонта I ад 1507 г. у асобныя рубрыкі вылучаны «москвичи». З гэтых фрагментаў дакумента нам становіцца вядома, што харчаванне і грошы ад гаспадара павінны былі атрымаць *Остафеи*, *Ивашка*, *Данила*, *Иван*, *Васка*, *Ларивон*, *Слепец*, *Федор*, *Черкас* [15, с. 399–400]. Там жа грашовыя сумы прызначаліся «Тферичом»: *Игнату*, *Петру*, *Василью* [15, с. 400]. У 1516 г. на сваволю віленскага канюшага скардзіліся «москвичи» *Тишко*, *Федько*, *Васюк* [16, слп. 404–405].

Нярэдка акрамя імя і мянушкі крыніцы паведамляюць і імя па бацьку асобы, напрыклад: *Михал Степанов сын*, *Степан Федоров сын* [17, с. 161]. У некаторых выпадках, аднак, не ўдаецца ўстанавіць, што маецца на ўвазе – імя бацькі, дзеда ці родавае празванне. У запісах «данин» Казіміра, напрыклад, прыгадваецца масквіцін *Семен Галарев* [18, с. 35]. У перапісе «дворян всих короля его милости у Великом князстве» у рубрыцы «москвичи новые» названы *Василеи Борисов*, *Павел Фимин*, *Гридя Ермолин* і інш. [15, с. 165]. Тут *Галарев*, *Борисов*, *Фимин*, *Ермолин* з роўнай ступенню верагоднасці могуць выступаць у якасці адной з названых ідэнтыфікуючых прыкмет.

Неабходна адзначыць, што многія эмігранты выступаюць у дакументах метрыкі ВКЛ пад трохчленнымі найменнямі, дзе адзін з трох элементаў можа быць родавым празваннем, напрыклад: *Поросуков Иван Степанович* [19, с. 165]. У адным з выпадкаў гэта амаль не выклікае сумнення: пад 1516 г. згадваецца «москвитин» *Григореи Унковскии* [20, с. 308]. Але нават пры наяўнасці такой інфармацыі высветліць з пэўнай ступенню дакладнасці, ад каго паходзілі, які статус мелі і каму служылі яго родзічы, не дазваляе стан крыніц, хоць само імя сустракаецца ва ўказной грамаце вялікага князя маскоўскага ад 27 жніўня 1538 г. Яе адрасатамі з'яўляліся Г. Ф. Забалоцкі і *Р. В. Унковский*, відаць, цвярскія пісцы [21, с. 9]. Аднак знайсці нейкую сувязь паміж Ункоўскім, вядомым па метрыцы ВКЛ, і Ункоўскім, выступаючым у названай маскоўскай грамаце, не ўяўляецца магчымым, хоць, гіпатэтычна, яна магла існаваць.

Супастаўленне такіх антрапанімічных дадзеных можа быць выніковым у тых выпадках, калі гаворка ідзе аб вядомых імёнах. Так, пад 1487 г. сярод служэбнікаў князя Сямёна Шамячыча прыгадваецца вышэйзгаданы князь Давід Кубенскі. Сямён быў сынам эміграваўшага ў ВКЛ Івана Дзмітрыевіча і ўнукам Дзмітрыя Шамякі. М. М. Кромам было заўважана, што апошні меў сярод сваякоў князёў Заазерскіх-Кубенскіх. Такім чынам, мы можам меркаваць, што некаторыя з іх патрапілі ў ВКЛ разам з князем Іванам і там працягвалі служыць Шамячычам [3, с. 65]. Неабходна дадаць, што ніякіх іншых родаў, якія б прызываліся Кубенскімі, не вядома ні ў ВКЛ, ні ў Маскоўскай дзяржаве.

Трэба адзначыць, што, на жаль, з-за адсутнасці крыніц маскоўскага паходжання першай паловы XVI ст., якія б утрымлівалі больш-менш рэпрэзентатыўныя спісы шараговага баярства, а таксама нярэдка з-за нізкай інфарматыўнасці «літоўскіх» крыніц высвятленне паходжання многіх эмігрантаў (род, зямля/ княства) альбо не прадстаўляецца магчымым, альбо магчыма толькі гіпатэтычна з рознай ступенню верагоднасці ў кожным канкрэтным выпадку.

**Заключэнне**. Такім чынам, масу эмігрантаў з ліку прывілеяванага саслоўя зямель Русі ў ВКЛ можна падзяліць на дзве вялікія катэгорыі: тытулаваную і нетытулаваную знаць. Першая, колькасна меншая, складаецца з дзвюх груп – удзельных і вялікіх князёў і служылых князёў. Другая дзеліцца (з пэўнай доляй умоўнасці) на баярскую арыстакратыю і дзяцей баярскіх. Правесці больш дакладную дыферэнцыяцыю апошняй з названых груп не дазваляюць крыніцы.

## Літаратура


1. Кром, М. М. «Отъезды» московской знати в Литву во второй четверти XVI в. / М. М. Кром // Феодальная Россия. Новые исследования: сб. науч. ст.; под ред. М. Б. Свердлова – СПб., 1993. – С. 34–37.

2. Полное собрание русских летописей, изданное по высочайшему повелению археографической комиссией: в 24 т. / СПб.; Л.: Типография Э. Праца, 1841–1921. – Т. 7.: Летопись по Воскресенскому списку. – 1856. – 345 с.

3. Кром, М. М. Меж Русью и Литвой. Западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI вв. / М. М. Кром. – М.: Археографический центр, 1995. – 304 с.

4. Казакоў, А. У. Абставіны і вынікі княскай эміграцыі з Маскоўскай дзяржавы ў Вялікае княства Літоўскае ў другой палове XV ст. // Труды БГТУ. Сер. V, Политология, философия, история, филология. – 2007. – Вып. XV. – С. 134–137.

5. Экземплярский, А. В. Великие и удельные князья в татарский период, с 1238 по 1501 г.: биограф. очерки: в 2 т. / А. В. Экземплярский. – СПб.: Типография Императорской Академии наук, 1891. – Т. 2: Владетельные князья Владимирских и Московских уделов и великие удельные владетельные князья Суздальско-Нижегородские, Тверские и Рязанские. – X, 696 с.

6. Зимин, А. А. Формирование боярской аристократии в России во второй половине XV – первой трети XVI вв. / А. А. Зимин. – М.: Наука, 1988. – 350 с.

7. Памятники дипломатических сношений древней России с державами иностранными. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством, 1487–1533 / под ред. Г. Ф. Карпова // Сборник Императорского русского исторического общества.– СПб.: Университетская типография, 1882. – Т. 35 (1). – 872 с.

8. Wolff, J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1895. – XXV, 698 s.

9. Кром, М. М. Судьба авантюриста: князь Семен Федорович Бельский / М. М. Кром // Очерки феодальной России: сб. науч. ст., под ред. С. Н. Кистерева. – 2000. – Вып. 4. – С. 98–115.

10. Herbarz polski Kaspra Niesieckiego S. J.; powiekszony dodatkami z póznejszych autorów, rękopismów i dowodów urzędowych i wydany przez Jana Nep. Bobrowicza: w 10 t. – Lipsk [Leipzig]: nakładem i drukiem Breitkopfa Haertela, 1839–1845. – T. VII. – 1841. – 652 s.

11. Безроднов, В. Родословие князей Стародубских и происхождение князей Путятиных (по материалам синодика князей Микитиничей-Головчинских) / В. Безроднов // Генеалогический вестник. – СПб., 2001. – Вып. 3. – С. 31–34.

12. Казакоў, А. У. Князь Мацвей Мікіцініч: паходжанне і эміграцыя / А. У. Казакоў // Studia Historica Europae Orientalis: Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. / Республиканский институт высшей школы. – Минск, 2008. – Вып. 1. – С. 77–83.

13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд КМФ-18. – Спр. 19. «Тые справы почали приехавшы господарю королю Жикгимонту до Кракова лета божего 1535, мца августа 7 дня, инд. 8, за пана Михайла писара и державцу медницкого». 1535–1537.

14. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Спр. 226. Каралеўскія рашэнні. 1529–1534.

15. Lietuvos Metrika. Kn. 8 (1499–1514): Užrašymų knyga 8 / Lietuvos istorijos institutas; parengė A. Baliulis, R. Firkovičius, D. Antanavičius. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1995. – 709 p.

16. Литовская метрика. Отд. 1. Ч. 2. Книги судных дел // Русская историческая библиотека. Т. 20 (1). – СПб.: Сенатская типография, 1903. – VII, 290 с., 1566 стб., 152 с.

17. Антонов, А. В. Списки русских пленных в Литве первой половины XVI века / А. В. Антонов, М. М. Кром // Архив русской истории. – М., 2002. – Вып. 7. – С. 149–196.

18. Lietuvos Metrika. Kn. 3 (1440–1498): Užrašymų knyga 3 / Lietuvos istorijos institutas; parengė L. Anužytė, A. Baliulis. – Vilnius: Žara, 1998. – 165 p.

19. Lietuvos Metrika. Kn. 227 (1533–1535): Teismų bylų knyga 8 / Vilniaus universitetas; I. Valikonite [ir kt.]. – Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 1999. – 400 p.

20. Lietuvos Metrika. Kn. 9 (1511–1518): Užrašymų knyga 9 / Uniwersytet im. Adama Mickiewicza w Poznaniu; K. Pietkiewicz. – Vilnius: Zara, 2002. – 615 p.

21. Кром, М. М. Политический кризис 30–40-х годов XVI века (постановка проблемы) / М. М. Кром // Отечественная история. – 1998. – № 5. – С. 3–19.